Установа адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
__________ Ю.Я. Раманоўскі
«28» 06 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-520/24 /уч.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
**6-05-0112-01 «Дашкольная адукацыя»;**
**6-05-0114-01 «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя»**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0112-01-2023 і ОСВО АСВА 6-05-0114-01-2023, вучэбных планаў па спецыяльнасцях: 6-05-0112-01 «Дашкольная адукацыя». Рэгістрацыйны № 01-23/уч. ГФ ад 04.04.2023; рэгістрацыйны № 16-24/уч. ГФ ад 26.04.2024 для дзённай формы атрымання адукацыі; рэгістрацыйны № 01-23/уч.з. ГФ ад 04.04.2023 для завочнай формы атрымання адукацыі; 6-05-0114-01 «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя». Рэгістрацыйны №04-23/уч. ГФ ад 04.04.2023; Рэгістрацыйны №17-24/уч. ГФ ад 26.04.2024.

СКЛАДАЛЬНІК:

Таццяна Робертаўна Багарадава, дацэнт кафедры сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДЛЯ ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай сусветнай літаратуры і замежных моў установы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 7 ад «10» 06 2024 г.)

Метадычнай камісіяй гуманітарнага факультэта ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай»
(пратакол № 10 ад «26» 06 2024 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» займае важнае месца ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй. Мова з'яўляецца галоўным інструментам інфармацыйнага ўздзеяння, фарміравання грамадзянскасці і патрыятызму, ажыццяўлення сацыяльнага ўзаемадзеяння.

Асаблівасці сацыялінгвістычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь, павышэнне матывацыі публічнай маўленчай дзейнасці патрабуюць ад вышэйшай школы рыхтаваць не толькі спецыяліста, але і камунікатыўна развітую асобу, білінгвальна падрыхтаваную, якая на дастатковым узроўні можа наладжваць зносіны на нацыянальнай мове ў прафесійна-справавой і навуковай сферах.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» далучае навучэнцаў да сістэмы нацыянальных каштоўнасцей, спрыяе авалоданню на высокім узроўні маўленчай культурай у прафесійных зносінах, садзейнічае лагічнасці, выразнасці, правільнасці і дакладнасці маўлення будучага спецыяліста. У працэсе навучання студэнты авалодваюць спецыяльнай тэрміналагічнай лексікай, вучацца граматна, лагічна і паслядоўна выкладаць свае думкі ў вуснай і пісьмовай формах, дарэчна карыстацца моўнымі нормамі ва ўмовах білінгвізму, у залежнасці ад мэтаў камунікацыі працаваць з прафесійна арыентаванымі і навуковымі тэкстамі, весці дакументацыю, выступаць з публічнымі прамовамі і навуковымі паведамленнямі. Авалоданне студэнтамі праграмай вучэбная дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» будзе спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыіў Рэспублліцы Беларусь.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны:** выпрацаваць у студэнтаў на першай ступені вышэйшай адукацыі якасныя ўменні і навыкі эфектыўнага выкарыстання моўных сродкаў у прафесійнай камунікатыўнай дзейнасці.

**Задачы вучэбнай дысцыпліны:**

-замацаваць і ўдасканаліць веды па беларускай літаратурнай мове ў яевуснай і пісьмовай формах;

-садзейнічаць выпрацоўцы ўмення арыентавaццаўтэарэтычных і практычных праблемах функцыянавання беларускай мовы;

-стварыць цэласнае сістэмнае ўяўленне аб функцыянаванні мовы ў яе стылявых разнавіднасцях;

-садзейнічаць фарміраванню і павышэнню культуры маўлення, у тым лікупрафесійнага, будучых спецыялістаў;

-дапамагчы выпрацаваць уменні і навыкі самастойнага аналізу моўных з'яў;

-спрыяць узбагачэнню слоўнікавага запасу навучэнцаў;

-удасканаліць навыкі і ўменні яка снага і дакладнага перакладу спецыяльных тэкстаў з рускай мовы на беларускую і наадварот;

-спрыяць выпрацоўцы ў студэнтаў навыкаў правільнага, дакладнага, чыстага, выразнага і разнастайнага маўлення;

-сфарміраваць уменне мэтазгоднага выкарыстання сродкаў беларускаймовы ў навуковай і практычнай дзейнасці;

-заахвочваць да практычнага ўкаранення атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці;

-выхоўваць павагу да духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, фарміраваць імкненні да перспектыўнага развіцця беларускай мовы;

-спрыяць фарміраванню камунікатыўна развітой асобы, здольнай наладжваць кантакты на нацыянальнай мове.

Змест вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» карэлюецца са зместам вучэбных дысцыплін «Замежная мова» (знаёмства з найноўшымі тэхналогіямі, адкрыццямі і тэндэнцыямі ў галіне тэхнікі і інфарматыкі), «Філасофія» (асветнікі Беларусі).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны навучэнец павінен:

***ведаць*:**

-ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыялізацыі асобы; месца і ролю беларускай мовы ў славянскім свеце;

-паходжанне і этапы развіцця беларускай мовы, фарміраванне яе графічнай сістэмы;

-персаналіі заснавальнікаў беларускай лінгвістыкі;

-функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, іх жан-равыя разнавіднасці;

-спецыфіку сістэмы функцыянальных стыляў беларускай літаратурнаймовы;

асаблівасці фарміравання навуковага стылю;

-адметнасці навуковага і афіцыйна-справавога стыляў і сфераў іх прымянення;

структуру лексікі беларускай мовы;

-асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з рускай;

-сістэму літаратурных нормаў беларускай мовы;

***умець*:**

-характарызаваць асаблівасці функцыянальных стыляў;

-ствараць тэксты розных жанраў, свядома карыстаючыся моўным матэрыялам, адэкватна стылю, мэце, сітуацыі і тэме выказвання;

-выкарыстоўваць стылістычныя нормы, згодна з сітуацыяй прафесійныхабо справавых зносін.

-аналізаваць асаблівасці беларуска-рускага і руска-беларускага білінгвізму; інтэрпрэтаваць моўную палітыку дзяржавы ў гістарычным кантэксце;

-аналізаваць моўную сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе;

***валодаць навыкамі і ўменнямі*:**

-эфектыўных маўленчых паводзін у розных сітуацыях прафесійных і спра-вавых зносін;

-карыстацца моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці; адэкватна перакладаць навуковыя, спецыяльныя і службовыя

тэксты з рускай на беларускую мову і наадварот, улічваючы стылістычную прыналежнасць і асаблівасці лексіка-граматычнай будовы тэксту;

-кампрэсіі і разгортвання навуковай інфармацыі, анатавання, рэферыравання і рэдагавання;

-пісьменнага афармлення справавых дакументаў.

Студэнт павінен набыць наступную кампетэнцыю:

УК-12: Выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца: усяго вучэбных гадзін – 60, з іх 34 гадзіны аўдыторных заняткаў (практычныя заняткі – 34 гадзіны), самастойная праца студэнтаў – 26 гадзін.

Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 3 курсе ў 5 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – завочная.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі па спецыяльнасці на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны адводзіцца: усяго вучэбных гадзін – 60, з іх 6 гадзін аўдыторных заняткаў (практычныя заняткі – 6 гадзін), самастойная праца студэнтаў – 54 гадзіны. Вучэбная дысцыпліна вывучаецца на 2 курсе ў 3 семестры.

Форма прамежкавай атэстацыі – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## МОДУЛЬ 1. АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЯ СФЕРА

### Тэма 1. БЕЛАРУСКАЯ МОВА ЯК ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

Суадносіны мовы і культуры. Беларуская нацыянальная мова і духоўная культура народа. Функцыі беларускай мовы як асноўнага кампанента нацыянальнай культуры. Роля вуснай народнай творчасці ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей. Ідыяматычнасць мовы.

### Тэма 2. СІСТЭМНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Структура беларускай нацыянальнай мовы. Вызначальныя рысы літаратурнай мовы. Тэрытарыяльныя дыялекты. Узроўні моўнага развіцця (фанетыч- ны, арфаэпічны, словаўтваральны, лексічны, марфалагічны, сінтаксічны). Стандарты беларускай літаратурнай мовы (“тарашкевіца” і “наркамаўка”). Мова і маўленне. Функцыі мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін.

### Тэма 3. БЕЛАРУСКАЯ МОВА СЯРОД ІНШЫХ МОЎ

Генеалагічная класіфікацыя моў. Моўныя сем’і, групы і падгрупы. Месца беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў. Асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі. Беларуская мова сярод усходнеславянскіх моў. Параўнанне тэкстаў беларускай, украінскай, рускай, польскай, балгарскай і чэшскай моў. Даўнія і новыя запазычанні з іншых моў у беларускай мове. Вывучэнне беларускай мовы ў рэспубліцы і за мяжой.

### Тэма 4. ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Перыядызацыя беларускай мовы. Гістарычны падыход да разумення працэсаў моўнага развіцця. Агульнаўсходнеславянская мова (X-XIII стст.) як пачатак фарміравання пісьмовай мовы беларускай народнасці. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Старажытныя рукапісныя і друкаваныя помнікі на беларускай мове. Лёс беларускай мовы ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Новая беларуская літаратурная мова XIX - пачатку XX стст. Роля Яна Чачота, Францішка Багушэвіча, Вінцэнта Дуніна- Марцінкевіча ў працэсе адраджэння беларускай мовы. Гістарычныя назвы беларускай мовы. Працэсы ўнармавання беларускай мовы: «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча 1918 г., пашырэнне грамадскіх функцый беларускай мовы ў 1920-я гг., Акадэмічная канферэнцыя 1926 г., рэформа беларускай мовы 1933 г., правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 г. і 2008 г. Гісторыя графічных сістэм беларускай мовы. Роля беларусаў ва ўдасканаленні кірыліцы. Гісторыя і сучаснасць беларускай лацінкі. Беларускія тэксты, напісаныя арабскай графікай. Аналіз моўных асаблівасцей тэкстаў, створаных у розныя гістарычныя этапы функцыянавання беларускай мовы.

### Тэма 5. МОЎНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Стан і статус беларускай мовы ў канцы XX - пачатку XXI стст. у Рэспубліцы Беларусь. Сацыялінгвістычныя працэсы. Білінгвізм як аб’ектыўная рэчаіснасць у краінах свету, разнавіднасці і тыпы двухмоўя. Гістарычныя вытокі

білінгвізму ў Беларусі. Псіхалагічны, педагагічны, сацыялінгвістычны аспекты білінгвізму. Паняцце моўнай інтэрферэнцыі і яе віды. Праблемы інтэрферэнцыі. Феномен "трасянкі". Аналіз сучасных узораў інтэрферэнцыі.

Тэма 6. НОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Паняцце моўнай нормы. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення.

Марфалагічныя асаблівасці назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў. Скланенне прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў. Асаблівасці ужывання прыслоўяў з лічэбнікамі, лічэбнікаў з назоўнікамі. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў ў беларускай мове. Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў з рускай мовы.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненні ў кіраванні дзеясловаў і выкарыстанні прыназоўнікаў (па, праз, да, паводле, на, з) у некаторых словазлучэннях у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

Асаблівасці перакладу з блізкароднасных моў. Спецыфіка беларускай граматычнай сістэмы і яе трансфармацыя пры перакладзе.

МОДУЛЬ 2. НАВУЧАЛЬНА-ПРАФЕСІЙНАЯ СФЕРА

Тэма 7. ЛЕКСІЧНАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Паняцце лексікі як упарадкаванага і сістэмнага слоўнікавага складу мовы.

Дыферэнцыяцыя беларускай лексікі. Лексіка паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная; безэквівалентная), ступені ўжывання (актыўная і пасіўная), стылістычнай прыналежнасці (стылістычна нейтральная і афарбаваная), сферы выкарыстання (агульнаўжывальная і абмежаванага ўжытку). Сацыяльныя дыялекты (жарганізмы). Спецыяльная лексіка.

Тэма 8. СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ЛЕКСІКА

Разрады спецыяльнай лексікі (тэрміны, наменклатура, прафесіяналізмы). Спецыфіка тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. Тэндэнцыі ў развіцці лексічнага складу беларускай літаратурнай мовы (інтэрнацыяналізацыя, нацыяналізацыя, пурызм, збліжэнне і адштурхоўванне ў дачыненні да рускай і польскай моў).

Тэма 9. ТЭРМІНАЛОГІЯ ЯК ВЯДУЧЫ СКЛАДНІК ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

Паняцце тэрміна. Крытэрыі вылучэння тэрміна. Тэрміналогія і тэрмінасістэма. Месца тэрміналогіі ў лексічнай сістэме беларускай мовы. Працэсы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі. Агульнанавуковая і вузкаспецыяльная тэрміналогія.

Тэма 10. СПОСАБЫ І СРОДКІ ЎТВАРЭННЯ ТЭРМІНАЎ РОЗНЫХ ГАЛІН ДЗЕЙНАСЦІ.

Словаўтваральныя паказчыкі тэрмінаў. Варыянтнасць тэрмінаў. Неўласцівыя суфіксы і словаўтваральныя фарманты беларускага тэрмінаўтварэння. Сродкі перакладу тэрмінаў. Адаптацыя запазычаных тэрмінаў у беларускай мове.

Сістэмныя адносіны ў галіне тэрміналагічнай лексікі: тэрміны-полісеманты, тэрміны-сінонімы, тэрміны-антонімы, міжгаліновыя амонімы.

Тэма 11. ФУНКЦЫЯНАЛЬНЫЯ СТЫЛІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай мовы. Агульная характарыстыка стыляў беларускай мовы. Тыпалагічныя прыметы функцыянальных стыляў і падстыляў: тэматыка, прызначэнне, моўныя асаблівасці. Стылістыка як тэарэтычная база культуры маўлення.

Тэма 12. СТЫЛІСТЫЧНАЯ СПЕЦЫФІКА

Спецыфіка размоўна-гутарковага стылю, публіцыстычнага стылю, стылю мастацкай літаратуры. Актуальныя працэсы ў сістэме функцыянальных стыляў. Канфесійны стыль, інтэрнэт-маўленне, стыль рэкламы і піяр-тэхналогій. Узаемаўплыў стыляў ва ўмовах інфарматызацыі грамадства.

Вызначэнне стылявой прыналежнасці тэксту паводле набору тыпалагічных прымет.

Тэма 13. НАВУКОВЫ СТЫЛЬ

Агульная характарыстыка навуковага стылю і яго падстыляў. Гісторыя станаўлення навуковага стылю беларускай літаратурнай мовы.

Моўная арганізацыя тэкстаў навуковага стылю. Марфалагічныя асаблівасці: абстрактныя назоўнікі, высокая частотнасць назоўнікаў роднага склону; зваротныя дзеясловы; асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў; аўтарскае “мы”. Частотнасць ужывання агульнанавуковых дзеясловаў і іх роля ў сінтаксічных канструкцыях навуковага тэксту. Роля злучнікаў і злучальных слоў у навуковым тэксце. Складназалежныя сказы.

Рубрыкацыя навуковага тэксту. Сродкі апісання аб’екта, прадмета, мэты, задачы, метадаў, высноў, вынікаў даследавання ў навуковым тэксце. Асаблівасці загалоўка ў навуковым тэксце. Аналіз і пераклад профільных навуковых тэкстаў.

Тэма 14. КАМПАЗІЦЫЙНА-СТРУКТУРНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ТЭКСТАЎ НАВУКОВАГА СТЫЛЮ

Тыпы навуковага маўлення (апісанне, разважанне, доказ, апавяданне). Тэкстаўтваральныя катэгорыі: цэласнасць, звязнасць, члянімасць, лагічнасць. Завершанасць як асноўная уласцівасць навуковага тэксту. Моўныя сродкі стварэння дакладнасці і лагічнасці. Сродкі сувязі на ўзроўні сказаў, абзацаў, адрэзкаў тэксту (лексічныя паўторы, указальныя і асабовыя займеннікі, пабочныя словы). Сродкі лагічнай сувязі (злучнікі, прыслоўі, пабочныя словы). Паказчыкі ступені аб’ектыўнай навуковай інфармацыі, выражэнне суб’ектыўнай думкі, спасылкі на крыніцу інфармацыі. Афармленне цытат і спасылак у навуковым тэксце.

Словы-дамінанты ў тэкстах розных навук. Паняцце падмовы навукі (інфарматыкі, матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі і інш.). Невербальныя сродкі стварэння дакладнасці (графікі, табліцы, схемы). Этыка навуковых даследаванняў.

Тэма 15. ПРЫЁМЫ РЭДАГАВАННЯ НАВУКОВАГА ТЭКСТУ

Прынцыпы разгортвання інфармацыі ў навуковым тэксце. Структурна-семантычныя прынцыпы кампрэсіі інфармацыі. Трансфармацыя складаназалежных сказаў у простыя. Адпрацоўка трансфармацыйных прыёмаў кампрэсіі і разгортвання інфармацыі. Выдзяленне асноўнай і дадатковай інфармацыі.

Стылістычныя нормы і камунікатыўныя якасці ў навуковым тэксце. Класіфікацыя стылістычных памылак і спосабы іх выпраўлення. Фарміраванне індывідуальнага стылю навукоўца.

Міждысцыплінарны падыход пры правядзенні навуковых даследаванняў. Узаемасувязь лінгвістыкі і дакладных навук.

Тэма 16. ЖАНРЫ НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Сістэма жанраў сучаснай навуковай літаратуры. Кампазіцыйна-змястоўная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата, тэзісаў. Структурна-семантычны аналіз анатацый. Віды анатацый. Бібліяграфія і тэкст анатацыі. Лексіка-граматычныя клішэ анатацыі і рэферата.

Складанне анатацый да тэкстаў розных стыляў.

Тэма 17. АФІЦЫЙНА-СПРАВАВЫ СТЫЛЬ

Асноўныя характарыстыкі афіцыйна-справавога стылю. Групы афіцыйна-справавой дакументацыі (асабістыя, распараджальныя, адміністрацыйна-арганізацыйныя, інфармацыйна-даведачныя, справавыя лісты, фінансавыя і ўліковыя дакументы). Лексіка-граматычныя асаблівасці мовы справавых папер і службовых дакументаў. Паняцце канцылярскага штампа. Тэкст службовага дакумента. Правілы афармлення дакументаў. Спосабы выкладання матэрыялу ў дакуменце: канстатацыя, паведамленне, апісанне. Суразмернасць частак дакумента. Прынцыпы афіцыйнага электроннага ліставання.

Тэма 18. КУЛЬТУРА ПРАФЕСІЙНАГА МАЎЛЕННЯ

Паняцце культуры маўлення. Кампаненты культуры маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, дарэчнасць, чысціня, багацце). Нацыянальная спецыфіка беларускага маўленчага этыкету і культуры зносін.

Тэма 19. ПРАФЕСІЙНАЕ МАЎЛЕННЕ

Прыёмы эфектыўнай публічнай камунікацыі. Узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў (міміка, жэсты). Выразнасць маўлення (інтанацыя, дыкцыя, паўзы). Асаблівасці маўленчых паводзінаў перад камерай і мікрафонам. Падрыхтоўка да выступлення па відэасувязі.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

## Дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі

| Нумар модуля (раздзела), тэмы, заняткаў | Назва модуля (раздзела), тэмаў, пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) заняткі | Лабараторныя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнта | | |
| **1.** | **Модуль 1. Агульнаадукацыйная сфера.** | | **8** | | **4** | | |
| 1.1. | **Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры.**<br>1.Суадносіны мовы і культуры.<br>2.Беларуская нацыянальная мова і духоўная культура народа.<br>3.Функцыі беларускай мовы як асноўнага кампанента нацыянальнай культуры.<br>4.Роля вуснай народнай творчасці ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей. Ідыяматычнасць мовы. | | **2** | | | [6, 17] | Апытанне |
| 1.2. | **Сістэмная арганізацыя беларускай мовы.**<br>1.Структура беларускай нацыянальнай мовы. 2. Вызначальныя рысы літаратурнай мовы. | | **2** | | | [13, 17] | Апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3.Тэрытарыяльныя дыялекты.<br>4.Узроўні моўнага развіцця.<br>5. Мова і маўленне.<br>5. Функцыі мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін. | | | | | | |
| 1.3. | **Беларуска мова сярод іншых моў.**<br>1.Генеалагічная класіфікацыя моў.<br>2.Моўныя сем'і, групы і падгрупы.<br>3.Месца беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці моў.<br>4.Асаблівасці беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі.<br>5.Беларуская мова сярод усходнеславянскіх моў. | | | | **2** | [1,6] | прэзентацыя |
| 1.4. | **Гісторыя беларускай літаратурнай мовы.**<br>1.Перыядызацыя беларускай мовы.<br>2.Гістарычны падыход да разумення працэсаў моўнага развіцця.<br>3.Лёс беларускай мовы ў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі.<br>4.Новая беларуская літаратурная мова XIX - пачат- ку XX стст.<br>5.Працэсы ўнармавання беларускай мовы: «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча 1918 г., пашырэнне грамадскіх функцый беларускай мовы ў 1920-я гг., Акадэмічная канферэнцыя 1926 г., рэформа беларускай мовы 1933 г., правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі 1959 г. і 2008 г. | | **2** | | | [6, 12, 13] | Апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 6.Гісторыя графічных сістэм беларускай мовы. | | | | | | |
| 1.5. | **Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь.**<br>1.Стан і статус беларускай мовы ў канцы XX - пачатку XXI стст. у Рэспубліцы Беларусь.<br>2.Сацыялінгвістычныя працэсы.<br>3.Білінгвізм як аб'ектыўная рэчаіснасць у краінах свету, разнавіднасці і тыпы двухмоўя.<br>4.Гістарычныя вытокі білінгвізму ў Беларусі.<br>5.Псіхалагічны, педагагічны, сацыялінгвістычны аспекты білінгвізму.<br>6.Панящце моўнай інтэрферэнцыі і яе віды. | | **2** | | | [6, 13] | Самастойная работа |
| 1.6. | **Нормы беларускай літаратурнай мовы**<br>1.Панящце моўнай нормы.<br>2.Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення.<br>3.Марфалагічныя асаблівасці назоўнікаў, прыметнікаў, займеннікаў, лічэбнікаў, дзеясловаў.<br>4.Скланенне прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання прыметнікаў і прыслоўяў.<br>5.Асаблівасці ужывання прыслоўяў з лічэбнікамі, лічэбнікаў з назоўнікамі. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў ў беларус-кай мове. Спосабы перакладу дзеепрыметнікаў з рускай мовы.<br>6.Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненні ў кіраванні дзеясловаў і выкарыстанні прыназоўнікаў (па, праз, да, паводле, на, з) у некаторых словазлучэннях у беларускай і рускай мовах. | | | | **2** | [3, 12, 13, 16] | Рэферат |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.<br>7.Асаблівасці перакладу з блізкароднасных моў. Спецыфіка беларускай граматычнай сістэмы і яе трансфармацыя пры перакладзе. | | | | | | |
| 2. | **Модуль 2. Навучальна-прафесійная сфера** | | **12** | | **10** | | |
| 2.1. | **Лексічная сістэма беларускай мовы.**<br>1.Паняцце лексікі як упарадкаванага і сістэмнага слоўнікавага складу мовы.<br>2.Дыферэнцыяцыя беларускай лексікі.<br>3.Лексіка паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная; безэквівалентная), ступені ўжывання (актыўная і пасіўная), стылістычнай прыналежнасці (стылістычна нейтральная і афарбаваная), сферы выкарыстання (агульнаўжывальная і абмежаванага ўжытку).<br>4.Сацыяльныя дыялекты (жарганізмы).<br>5.Спецыяльная лексіка. | | | | **2** | [1,6] | Тэст |
| 2.2. | **Спецыяльная лексіка.**<br>1.Разрады спецыяльнай лексікі (тэрміны, наменклатура, прафесіяналізмы).<br>2.Спецыфіка тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі. Тэндэнцыі ў развіцці лексічнага складу беларускай літаратурнай мовы (інтэрнацыяналізацыя, нацыяналізацыя, пурызм, збліжэнне і адштурхоўванне ў дачыненні да рускай і польскай моў). | | | | **2** | [1, 6, 9] | Рэферат |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.3. | **Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.**<br>1.Паняцце тэрміна.<br>2.Крытэрыі вылучэння тэрміна. Тэрміналогія і тэрмінасістэма.<br>3.Месца тэрміналогіі ў лексічнай сістэме беларускай мовы.<br>4.Працэсы тэрміналагізацыі і дэтэрміналагізацыі. Агульнанавуковая і вузкаспецыяльная тэрміналогія. | | 2 | | | [6, 11<br>10, 14] | Апытанне |
| 2.4. | **Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы.**<br>1.Стылістычная дыферэнцыяцыя беларускай мовы.<br>2.Агульная характарыстыка стыляў беларускай мовы.<br>3.Тыпалагічныя прыметы функцыянальных стыляў і падстыляў: тэматыка, прызначэнне, моўныя асаблівасці.<br>4.Стылістыка як тэарэтычная база культуры маўлення. | | | | 2 | [20] | Пісьмовае апытанне |
| 2.5. | **Навуковы стыль.**<br>1.Агульная характарыстыка навуковага стылю і яго падстыляў. Гісторыя станаўлення навуковага стылю беларускай літаратурнай мовы.<br>2.Моўная арганізацыя тэкстаў навуковага стылю.<br>3.Рубрыкацыя навуковага тэксту. | | | | 2 | [3, 10 , 14] | Праект |
| 2.6. | **Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкста навуковага стылю.**<br>1.Тыпы навуковага маўлення (апісанне, разважанне, доказ, апавяданне).<br>2.Сродкі сувязі на ўзроўні сказаў, абзацаў, адрэзкаў тэксту (лексічныя паўторы, указальныя і асабовыя займеннікі, пабочныя словы).<br>3.Сродкі лагічнай сувязі (злучнікі, прыслоўі, пабочныя | | 2 | | | [3 , 10, 20] | Напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме* |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | словы).<br>4.Афармленне цытат іспасылак у навуковым тэксце. | | | | | | |
| 2.7. | **Прыемы рэдагавання навуковага тэксту.**<br>1.Прынцыпы разгортвання інфармацыі ў навуковым тэксце.<br>2.Стылістычныя нормы і камунікатыўныя якасці ў навуковым тэксце.<br>3.Класіфікацыя стылістычных памылак і спосабы іх выпраўлення. Фарміраванне індывідуальнага стылю навукоўца.<br>4.Міждысцыплінарны падыход пры правядзенні навуковых даследаванняў. Узаемасувязь лінгвістыкі і дакладных навук. | | 2 | | | [6, 10] | Пераклад на беларускую мову навуковь тэкстаў |
| 2.8. | **Жанры навуковай літаратуры.**<br>1.Сістэма жанраў сучаснай навуковай літаратуры. Кампазіцыйна- змястоўная і лінгвістычная арганізацыя анатацыі, рэферата, тэзісаў.<br>2.Структурна-семантычны аналіз анатацый. Віды анатацый. | | 2 | | | [1, 9, 14] | Складанне анатацыі |
| 2.9. | **Афіцыйна-справавы стыль.**<br>1.Асноўныя характарыстыкі афіцыйна-справавога стылю.<br>2.Групы афіцыйна- справавой дакументацыі (асабістыя, распараджальныя, адміністрацыйна- арганізацыйныя, інфармацыйна-даведачныя, справавыя лісты, фінансавыя і ўліковыя дакументы).<br>3.Лексіка-граматычныя асаблівасці мовы справавых папер і службовых дакументаў. Паняцце канцылярскага штампа. | | | | 2 | [1, 9, 14] | Пісьмовае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2.10. | **Культура прафесійнага маўлення.**<br>1.Панящце культуры маўлення.<br>2.Кампаненты культуры маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, дарэчнасць, чысціня, багацце).<br>3.Нацыянальная спецыфіка беларускага маўленчага этыкету і культуры зносін. | | **2** | | | [1, 9, 13 , 12] | Праслухоўванне аналіз навуковых паведамленняў і публічных прамоў* |
| 2.11. | **Прафесійнае маўленне.**<br>1.Прыёмы эфектыўнай публічнай камунікацыі. Узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў (міміка, жэсты).<br>2.Выразнасць маўлення (інтанацыя, дыкцыя, паўзы). Асаблівасці маўленчых паводзінаў перад камерай і мікрафонам. | | **2** | | | [8] | Выступленне па відэасувязі |
| | **УСЯГО:** | | **20** | | **14** | | |

## Мерапрыемствы бягучага кантролю*

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

**Завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі**

| Нумар модуля (раздзела),тэмы, заняткаў | Назва модуля (раздзела), тэмаў, пераліквывучаемых пытанняў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія) | Лабараторыя заняткі | Кіруемая самастойная работа студэнта | | |
| 1. | **Модуль 1. Агульнаадукацыйная сфера.** | | 4 | | | | |
| 1.1. | **Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры.**<br>1.Суадносіны мовы і культуры.<br>2.Беларуская нацыянальная мова і духоўная культура народа.<br>3.Функцыі беларускай мовы як асноўнага кампанента нацыянальнай культуры.<br>4.Роля вуснай народнай творчасці ў фарміраванні нацыянальных каштоўнасцей. Ідыяматычнасць мовы. | | 2 | | | [6, 17] | Вуснае апытанне |
| 1.2 | **Моўная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь.**<br>1.Стан і статус беларускай мовы ў канцы XX - пачатку XXI стст. у Рэспубліцы Беларусь.<br>2.Сацыялінгвістычныя працэсы.<br>3.Білінгвізм як аб’ектыўная рэчаіснасць у краінах свету, разнавіднасці і тыпы двухмоўя.<br>4.Гістарычныя вытокі білінгвізму ў Беларусі.<br>5.Псіхалагічны, педагагічны, сацыялінгвістычны аспекты білінгвізму. | | 2 | | | [13, 17] | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 6.Паняцце моўнай інтэрферэнцыі і яе віды. | | | | | | |
| 2 | **Модуль 2. Навучальна-прафесійная сфера** | | **2** | | | | |
| 2.1 | **Лексічная сістэма беларускай мовы.**<br>1.Паняцце лексікі як упарадкаванага і сістэмнага слоўнікавага складу мовы.<br>2.Дыферэнцыяцыя беларускай лексікі.<br>3.Лексіка паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная; безэквівалентная), ступені ўжывання (актыўная і пасіўная), стылістычнай прыналежнасці (стылістычна нейтральная і афарбаваная), сферы выкарыстання (агульнаўжывальная і абмежаванага ўжытку).<br>4.Сацыяльныя дыялекты (жарганізмы).<br>5.Спецыяльная лексіка. | | 2 | | | [6, 12, 13] | Пісьмовае апытанне |
| | **УСЯГО:** | | 6 | | | | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная:**

1. Венедзіктаў, С.В. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэбны дапаможнік / С. В. Венедзіктаў, С. І. Даніленка. - Минск : Вышэйшая школа, 2019. - 126, [1] с. - (Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі). - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для курсантаў і студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных спецыяльнасцях.
2. Губская, В.М. Беларуская мова для эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. М. Губская, І. І. Шматкова. - Мінск : РІВШ, 2020. - 131 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па эканамічных спецыяльнасцях
3. Запрудскі, С.М. Нарысы гісторыі беларускага мовазнаўства XIX стагоддзя : дапаможнік / С. М. Запрудскі ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2020. - 193 с. - Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі,якія навучаюцца па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02.
4. Каценка, А.В. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэбны дапаможнік / А. В. Каценка, В. К. Мароз ; Акадэмія Міністэрства ўнутранных спраў Рэспублікі Беларусі. - 2-е выданне, перагледжанае. - Минск : Акад. МУС Рэсп. Беларусь, 2018. - 137 с. - (Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі). - Библиогр. : с. 109. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для курсантаў і студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных спецыяльнасцях.
5. Латушка, Г.П. Беларускія выразы згоды і нязгоды : вучэбна-метыдычны дапаможнік / Г. П. Латушка ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2020. - 134 с. - Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях 1-21 05 01 "Беларуская філалогія", 1-21 05 02 "Русская філалогія (па напрамках)", 1-21 05 04 "Славянская філалогія" .
6. Ляшчынская, В.А. Ідыяматыка беларускай мовы ў лінгвакультуралагічным асвятленні : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны. - Мінск : РІВШ, 2019. - 249 с. - Бібліягр. : с. 223-235. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "Беларуская філалогія (па напрамках)".

[illegible] Е. В.

7. Маршэўская, В.В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для юрыстаў і эканамістаў : вучэбны дапаможнік / В. В. Маршэўская, А. С. Садоўская. - Мінск : РІВШ, 2020. - 231 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па юрыдычных і эканамічных спецыяльнасцях.
8. Свістунова, М.І. Гістарычная марфалогія беларускай мовы : вучэбны дапаможнік / М. І. Свістунова, Г. К. Ціванова ; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. - Мінск : БДУ, 2018. - 198 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці "Беларуская філалогія (па напрамках)".
9. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэбны дапаможнік / Д. В. Дзятко [и др.] ; пад рэдакцыяй Д.В. Дзятко. - Мінск : Вышэйшая школа, 2017. - 588 с. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях.
10. Цыхун, Г.А. Прастора мовы. Моўныя сувязі. Гісторыя слоў : выбраныя працы / Г. А. Цыхун ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа ; укладальнік Я.В. Волкава. - Мінск : Беларуская навука, 2018. - 314, [1] с.
11. Янкоўскі, Ф.М. Гісторыя беларускай мовы : гістарычная граматыка / Ф. М. Янкоўскі ; навуковы рэдактар Д.В. Дзятко. - Наваполацк : Вышэйшая школа, 2019. - 263 с. - Библиогр. : с. 256-257. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па філалагічных спецыяльнасцях.

**Дадатковая:**

12. Беларуская мова, інтэрнет і камп'ютэр : матэрыялы круглага стала міжнар. сімпозіума "Разнастайнасць моў і культур у кантэксце глабалізацыі" (20 мая 2002 г., г. Мінск) / Таварыства бел. мовы імя Ф. Скарыны ; склад. С. Кручкоў. - Мінск : БелСаЭС Чарнобыль, 2002. - 66, [2] с. : іл.
13. Буракова, М. У. Анамастыка, тэрміналогія і фразеалогія : вучэбна-метадычны дапаможнік / М. У. Буракова, В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск : РІВШ, 2011. - 165 с. - Бібліягр. : с. 128-132. - Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем па гуманітарнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская мова (прафесійная лексіка)".
14. Куліковіч, У. І. Правілы сучаснай беларускай арфаграфіі : Вучэбны дапаможнік / У. І. Куліковіч. - Мінск : Новое знание, 2011. - 222 с.
15. Ляшчынская, В. А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэбны дапаможнік / В.А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.

16. Ляшчынская, В. А. Сучасная беларуская мова: фразеалогія : вучэбны дапаможнік / В. А. Ляшчынская ; Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, установа адукцыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны". - Мінск : РІВШ, 2010. - 229 с. - Библиогр. : с. 168-177. - Дапушчана Міністэрствам адукацыі РБ у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў вышэйшых навучальных ўстаноў па філалагічных спецыяльнасцях.
17.Руденко Е. Н. Белорусский язык. Профессиональная лексика : учеб. пособие для студ. вузов / Е. Н. Руденко, А. А. Кожинова, Е. Г. Задворная. - Мн. : ТетраСистемс, 2005. - 381 с.
18.Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. – Мінск. 1999

**Слоўнікі:**

19. Арашонкава, Г. У. Кароткі слоўнік беларускай мовы. Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1994.
20. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996–2004.
21. Булыка, А. М Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск, 1999.
22. Геаграфічныя паняцці і тэрміны: энцыклапедычны даведнік / рэдкал.: М. М. і інш. . – Мінск, 1993.
23. Граматычны слоўнік дзеяслова. – Мінск, 2007.
24. Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) і інш. . – Мінск. 1995.
25. Руска-беларускі слоўнік: у 3 т. – Мінск, 1995.
26. Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск, 1987.
27. Социологическая энциклопедия / под. общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск, 2003.
28. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск, 1977–1984.
29. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мінск, 2005.
30. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984–1987.
31. Энцыклапедыя прыроды Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1983–1986.
32. Этнаграфія Беларусі. – Мінск, 1989.
33. Юрыдычны энцыклапедычны слоўнік. – Мінск, 1992.

**Вучэбна-метадычныя комплексы:**

34. Вялюга, С. А., Зянько А. І. Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў нефілалагічных факультэтаў ПДУ / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Новаполацк : УА "ПДУ", 2010. – 286 с. (13.02.2013).

# ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕННЯ ЗАЛІКА

1. Беларуская нацыянальная мова, яе формы. Функцыі мовы ў грамадстве.
2. Гістарычныя этапы фарміравання і развіцця беларускай мовы.
3. Паняцце моўнай нормы. Сістэма норм літаратурнай мовы.
4. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.
5. Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы паводле паходжання.
6. Дыферэнцыяцыя лексікі беларускай мовы паводле сферы ўжывання.
7. Стылістычныя разрады лексікі беларускай мовы.
8. Паняцце «тэрмін», «тэрміналогія», «тэрмінасістэма». Асаблівасці тэрмінаў.
9. Асноўныя спосабы ўтварэння тэрмінаў.
10. Лексікаграфія. Тыпы слоўнікаў.
11. Некаторыя аспекты функцыянавання беларускай і рускай моў.
12. Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння.
13. Марфалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
14. Стылістычныя рэсурсы марфалогіі: назоўнік.
15. Стылістычныя рэсурсы марфалогіі: прыметнік.
16. Стылістычныя рэсурсы марфалогіі: займеннік.
17. Лічэбнік. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі.
18. Стылістычныя рэсурсы марфалогіі: дзеяслоў.
19. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці іх ужывання ўбеларускай мове.
20. Прынцыпы сучаснай беларускай арфаграфіі.
21. Сінтаксічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
22. Сінтаксіс. Адрозненні ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай іркускай мовах.
23. Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
24. Навуковы стыль, яго функцыі і характэрныя асаблівасці.
25. Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (даклад, артыкул, рэферат, анатацыя, рэзюмэ), агульныя патрабаванні да іх напісання і афармлення.
26. Лексічныя і фразеалагічныя асаблівасці навуковых тэкстаў.
27. Афіцыйна-справавыя дакументы, правілы іх напісання і афармлення.

Мова і маўленне. Віды і тыпы маўлення. Адзінкі маўлення.

## ПЕРАЛІК ТЭМ РЭФЕРАТАЎ

1. Родная мова – душа народа.
2. Мова і гістарычная памяць.
3. Рупліўцы на ніве роднай мовы.
4. Беларусы ў свеце.
5. Паходжанне назвы Белая Русь.
6. Нашы славутыя землякі.
7. Вядомыя беларускія лінгвісты.
8. Выдатныя дзеячы беларускай культуры.
9. Мой любімы пісьменік.
10. Мой любімы твор.
11. Народнае дойлідства Беларусі.
12. Сімволіка беларускіх народных песень.
13. Традыцыйныя народныя святы.
14. Старонкі беларускага народнага календара.
15. «Фізікі» і «лірыкі».
16. Псіхалогія публічнага выступлення.

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

### Змест самастойнай працы студэнтаў

(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
|---|---|---|
| | Модуль 1. Агульнаадукацыйная сфера. | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 1:1 | **Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры.** Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме "Сацыяльна- палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы". **Літаратура**: да ўсіх тэм асноўная літаратура -- Беларуская мова (прафесійная лексіка): вуч.-метад. комплекс для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 264 с. // Электронная бібліятэка УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» Электронны рэсурс http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/13575 | 2 |
| | Модуль 2. Навучальна-прафесійная сфера | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы . 2:1 | **Лексічная сістэма беларускай мовы.** Праца з прафесійнымі тэкстамі – лексічны аналіз слоў. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:2 | **Спецыяльная лексіка.** Пераклад сказаў з прафесійнай сферы на беларускую мову. Праца з электроннымі перакладчыкамі (Google translate, Yandex-перакладчык, Belazar). | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:3 | **Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.** Складанне тэрміналагічнага слоўніка па спецыяльнасці. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:4 | **Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы.** Аналіз памылак, якія дапускаюцца людзьмі ў час карыстання беларускай мовай. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:5 | **Навуковы стыль.** Пераклад на беларускую мову навуковых тэкстаў. | 2 |

| | | |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:6 | **Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкста навуковага стылю.**<br>Аналіз структуры навуковага тэксту. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:7 | **Прыемы рэдагавання навуковага тэксту.**<br>Анатацыя. Напісанне анатацыі. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:8 | **Жанры навуковай літаратуры.**<br>Курсавая работа: структура, моўная спецыфіка. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:9 | **Афіцыйна-справавы стыль**.<br>Афіцыйна-справавы стыль.<br>Скаданне афіцыйных папер. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:10 | **Культура прафесійнага маўлення.**<br>Аналіз стылёвых асаблівасцей тэкстаў, адпаведнасць маўленчым сітуацыям. | 2 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:11 | **Прафесійнае маўленне.**<br>Аналіз навуковых паведамленяў і публічных прамоў студэнтаў. Сбилась нумерация тем относительно учебно-методической карты | 4 |
| | **Усяго гадзін** | **26** |

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Змест самастойнай працы студэнтаў
(завочная форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| Від самастойнай працы | Тэматычны змест і выкарыстаныя крыніцы | Колькасць гадзін |
| --- | --- | --- |
| | Модуль 1. Агульнаадукацыйная сфера. | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 1:1 | **Беларуская мова як частка нацыянальнай культуры.** Складанне канспекта-прэзентацыі па тэме "Сацыяльна- палітычныя ўмовы функцыянавання беларускай мовы". **Літаратура**: да ўсіх тэм асноўная літаратура -- Беларуская мова (прафесійная лексіка): вуч.-метад. комплекс для студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей / С. А. Вялюга, А. І. Зянько. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – 264 с. // Электронная бібліятэка УА «Полацкі дзяржаўны універсітэт» Электронны рэсурс http://elib.psu.by:8080/handle/123456789/13575 | 4 |
| | Модуль 2. Навучальна-прафесійная сфера | |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы . 2:1 | **Лексічная сістэма беларускай мовы.** Праца з прафесійнымі тэкстамі – лексічны аналіз слоў. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:2 | **Спецыяльная лексіка.** Пераклад сказаў з прафесійнай сферы на беларускую мову. Праца з электроннымі перакладчыкамі (Google translate, Yandex-перакладчык, Belazar). | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:3 | **Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення.** Складанне тэрміналагічнага слоўніка па спецыяльнасці. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы 2:4 | **Функцыянальныя стылі беларускай літаратурнай мовы.** Аналіз памылак, якія дапускаюцца людзьмі ў час карыстання беларускай мовай. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:5 | **Навуковы стыль.** Пераклад на беларускую мову навуковых тэкстаў. | 4 |

| | | |
|---|---|---|
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:6 | **Кампазіцыйна-структурная арганізацыя тэкста навуковага стылю.**<br>Аналіз структуры навуковага тэксту. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:7 | **Прыемы рэдагавання навуковага тэксту.**<br>Анатацыя. Напісанне анатацыі. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:8 | **Жанры навуковай літаратуры.**<br>Курсавая работа: структура, моўная спецыфіка. | 6 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:9 | **Афіцыйна-справавы стыль.**<br>Афіцыйна-справавы стыль.<br>Складанне афіцыйных папер. | 4 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:10 | **Культура прафесійнага маўлення.**<br>Аналіз стылёвых асаблівасцей тэкстаў, адпаведнасць маўленчым сітуацыям. | 6 |
| Паглыбленае вывучэнне тэмы тэмы 2:11 | **Прафесійнае маўленне.**<br>Аналіз навуковых паведамленяў і публічных прамоў студэнтаў. Сбилась нумерация тем относительно учебно-методической карты | 6 |
| | **Усяго гадзін** | **54** |

# КАНТРОЛЬ ЯКАСЦІ ЗАСВАЕННЯ ВЕДАЎ

**Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці:**

-тэсціраванне;
-вуснае апытанне;
-пісьмовае апытанне;
-падрыхтоўка прэзентацыі;
-падрыхтоўка канспекта;
-абарона рэфератаў;
-пераклад прафесійных тэкстаў;
-напісанне анатацыі, рэферата, рэзюме;
-пераклад навуковых тэкстаў;
-складанне афіцыйных папер;
-праслухоўванн е і аналіз навуковых паведамленняў і публічных прамоў;
-выступленне па відэасувязі.

Дыягностыка якасці засваення ведаў ажыццяўляецца ў форме бягучага кантролю і прамежкавай аттэстацыі.

У рамках рэйтынгавай сістэмы пасняховасць студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне ацэньваецца з дапамогай мерапрыемстваў бягучага кантролю, якія праводзяцца на працягу семестра. Мерапрыемствы бягучага кантролю праводзяцца ў час аўдыторных заняткаў. Адзнакі, атрыманыя студэнтам у ходзе бягучага кантролю, выстаўляюцца па дзесяцібальнай шкале і фіксуюцца ў журнале выкладчыка. Для студэнта, які прапусціў мерапрыемства бягучага кантролю па ўважлівай прычыне, кафедрай устанаўліваюцца дадатковыя тэрміны. Студэнтам, якія прапусцілі мерапрыемства бягучага кантролю без уважлівай прычыны, выстаўляецца 0 (нуль) балаў за гэтае мерапрыемства.

Вынік бягучага кантролю за семестр ацэньваецца адзнакай у балах па дзесяцібальнай шкале і выводзіцца зыходзячы з адзнак, выстаўленых выкладчыкам (выкладчыкамі) падчас правядзення мерапрыемстваў бягучага кантролю на працягу семестра, по наступнай формуле:

$$БК = Б1+Б2+Б3........+ Бn / n,$$

дзе Б1,2…n – адзнака за мерапрыемства бягучага кантролю,

n – колькасць мерапрыемстваў бягучага контролю.

Дадзеная адзнака таксама ўлічвае вынікі ўдзелу студэнта ў навукова-практычных мерапрыемствах, вучэбна-даследчай, навукова-даследчай працы студэнтаў (канферэнцыях, семінарах, алімпіядах, конкурсах, навуковых гуртках і г.д.) па профілю дысцыпліны і можа быць павышана да 10 балаў пры дасягненні значных вынікаў у гэтай працы.

Пры правядзенні прамежкавай атэстацыі (заліку) адзнака «залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі па накапляльнай сістэме па выніках мерапрыемстваў бягучага кантролю выніковую адзнаку ад 4 да 10 балаў, адзнака «не залічана» выстаўляецца студэнтам, якія атрымалі ад 1 да 3 балаў. Апошнія здаюць залік па прапанаваных пытаннях да заліку.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя беларускай дзяржаўнасці | Кафедра тэхналогіі і методыкі выкладання | няма | |

Загадчык кафедры тэхналогіі і
методыкі выкладання, к.г.н, дацэнт Н.В. Даўгяла